

БЕЛТА

# ВЫСОКІ ГОНАР

## У Палацы Рэспублікі прайшло ўшаноўванне лаўрэатаў прэміі “За духоўнае адраджэнне”, спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва і “Беларускі спартыўны Алімп”

Па ўсталяванай традыцыі Прэзідэнт уручыў высокія ўзнагароды асабіста. Вось што ён сказаў, звяртаючыся да лаўрэатаў:

— Нам з вамі дасталася вялікая духоўная спадчына. Яна — у прыкладзе праведнага жыцця беларускіх святых, у падзвіжніцкіх дзеяннях прадстаўнікоў духавенства, у вялікіх тварэннях народжаных на нашай зямлі паэтаў, мастакоў, музыкантаў і дойлідаў. Яна — у духоўным подзвігу народа, які збярог веру, захаваў любоў да Радзімы, павагу да сваёй гісторыі і культуры, нягледзячы на неймаверныя выпрабаванні грозных ваенных часоў і сацыяльныя ўзрушэнні.

Выпрабаванняў, на жаль, хапае і сёння. Свет не стаў спакайнейшым, і Прэзідэнт гаварыў пра новыя выклікі сучаснасці:

— Ідзе нябачная барацьба ў тым ліку і за душу чалавека. З розных бакоў атакуюцца хрысціянскія асновы маралі.



# БЫЦЬ ЛЕПШЫМІ

Разбураюцца традыцыйныя сямейныя ўстоі. Пад уздзеяннем інфармацыйнага патоку змяняюцца светапогляд і лад жыцця людзей. Усё больш з'яўляецца спакусаў, усё цяжэй берагчы сэрцы ад цёмных думак і эмоцый. У пагоні за матэрыяльнымі дабротамі і знешняй мішурой людзі страчваюць сапраўдную прыгажосць — унутранае святло добрых пачуццяў і высакародных учынкаў, якімі славіўся і славіцца наш народ.

Людзей творчых у гэтай сітуацыі Аляксандр Лукашэнка заклікаў да рашучасці ды ініцыятыўнасці:

— Цяпер асабліва важна не ўпусціць час, не страціць нашу духоўную сутнасць. Першарадная роля ў гэтым, безумоўна, належыць культуры, мастацтву, рэлігіі. Іх уплыў на свядомасць чалавека вельмі вялікі. Менавіта гэтыя сферы фарміруюць тыя вобразы ды ідэалы, на якія многія арыентуюцца і прымаюць як эталон. Таму дзеячы культуры і мастацтва, работнікі сродкаў масавай інфармацыі, духавенства, педагогі і ўсе, каму неабыякава, якім будзе свет, павінны аб'яднаць намаганні дзеля ўмацавання маральных асноў нашага народа. Неабходны духоўны імунітэт супраць амаральнасці, пошласці і дрэннага густу, каб нашы культура і мастацтва заўсёды былі крыніцай энергіі і жыццеўстойлівасці для людзей.

Мы помнім і шануем багатую спадчыну былых пакаленняў. Нязгаснае святло іх высакародных пачуццяў і сёння паказвае нам шлях, напаўняе жыццё глыбокім сэнсам. А сучаснікі павінны надаць ёй больш сілы і яркасці, каб нашы дзеці і ўнукі маглі падхапіць эстафету часу і перадаць яе далей...

Асаблівасць сённяшняга дня Прэзідэнт бачыць у неверагоднай складанасці прагнозу нават бліжэйшай будучыні:

— Мне падаецца, што мы ўсе цяпер знаходзімся на ростанях. Выступаючы, я гавару пра традыцыйныя каштоўнасці, і многія, напэўна, думаюць: вось зноў чапляецца за старое. Але я і падкрэсліваю, што ў традыцыйных каштоўнасцях сутнасць наша, з якой мы прыйшлі ў сённяшні дзень. А хто можа сказаць, якім будзе заўтрашні дзень з пункту




БЕЛТА

Лаўрэаты спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва

гледжання мастацтва, маралі, творчасці, культуры ў цэлым, духоўнасці? Нам вельмі хацелася б, каб ён быў заснаваны на знаёмых для нас традыцыйных ісцінах. Нам было б так прасцей. Але хто стане сцвярджаць, што так будзе? Ніхто! Мы будзем, вядома, змагацца, каб гэтыя традыцыйныя каштоўнасці захаваць. Нам яны падаюцца фундаментальнымі. Яны не проста духоўныя, яны святыя. Мы будзем да гэтага імкнуцца. Але ці атрымаецца?

Аляксандр Лукашэнка прывёў відавочны прыклад імклівага змянення свету, звярнуўшы ўвагу на тое, як літаральна перавярнуў жыццё інтэрнэт. Яшчэ пяць гадоў назад ніхто не мог гэтага прадбачыць. Але тое, што адбылося, — факт. Сетка сёння шмат у чым вызначае наша жыццё. З аднаго боку, робіць яго больш зручным, спрашчае доступ да ведаў. Але з другога — хавае ў сабе нямала і небяспек. Змагацца з гэтым немагчыма. У новых рэаліях важна навучыцца жыць. Можа, нават падстроіць іх пад сябе. Але яшчэ важней, заклікае творчую інтэлігенцыю Прэзідэнт, перадаць гэтыя навыкі будучым пакаленням:

— Папрашу вас, эліту нашага грамадства, творчых людзей, давайце не будзем супрацівіцца гэтаму. Дарэмна. Страцім час і вялізныя сродкі. Давайце паспрабуем прыстасавацца да таго жыцця, якое паглынула нас, навучыўшы пры гэтым нашых дзяцей... карыстацца шмат якімі крыніцамі інфармацыі, авалодаць многімі ідэямі, каб рабіць правільныя высновы... Практыка, як нас вучылі, з'яўляецца крытэрыем ісціны, а ў моладзі яе не хапае. І тут ёй мы павінны падказаць: стаўце ўсё пад сумненне. Знаёмцеся з рознымі пунктамі гледжання і, грунтуючыся на падказцы, на досведзе старэйшых, выбірайце той, які сёння адпавядае проста нармальнаму жыццю нашага грамадства. І гэты тэзіс у бліжэйшыя месяцы мы павінны яшчэ сур'ёзна асэнсаваць на дзяржаўным узроўні...

Аляксандр Лукашэнка шчыра пажадаў лаўрэатам шчасця, творчага натхнення і новых поспехаў на жыццёвым шляху. Сваёй актыўнай дзейнасцю яны ствараюць вакол сябе аўру дабра і міласэрнасці. Яны адраджаюць старажытныя традыцыі беларускіх майстроў, абуджаюць цікавасць да гістарычных дасягненняў нашых продкаў. Адстойваюць сямейныя каштоўнасці, развіваюць дабрачыннасць, выхоўваюць пачуццё патрыятызму ў людзей... Прывіваюць шчырую любоў да высокага мастацтва. Падымаючыся на спартыўны Алімп, праслаўляюць краіну на сусветным узроўні, абуджаюць у сэрцах пачуццё гонару за свой народ і сваю Радзіму.

Асобна Прэзідэнт падзякаваў усім, хто прыняў удзел у традыцыйнай навагодняй акцыі "Нашы дзеці". Вялікую справу зрабілі разам, падарыўшы радасць тым маленькім грамадзянам, якія па волі лёсу ёю абдзелены.

Нашы лаўрэаты вартыя самых высокіх узнагарод. Яны — гонар нацыі і прыклад для ўсіх!

## Гавораць лаўрэаты

**Старшыня грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын", намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна Шчоткіна:**



*— Для нас гэта прызнанне дзейнасці нашага грамадскага аб'яднання. Гэта давер да арганізацыі і вельмі вялікая адказнасць, якая абавязвае ўдасканальваць сваю работу, адпавядаць патрабаванням часу. Але пры гэтым вельмі важна захаваць пераемнасць і традыцыі. На працягу 25 гадоў наша мэта застаецца нязменнай — гэта ўмацаванне маральных і духоўных каштоўнасцяў. Намаганні накіраваныя на падтрымку сям'і ды ўмацаванне сямейных адносінаў, абарону правоў і законных інтарэсаў маці і дзяцей, павышэнне ролі жанчын у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці краіны. Асаблівую ўвагу мы ўдзяляем дабрачыннай і гуманітарнай дзейнасці. Вялікая ўвага і развіццю жаночага прадпрымальніцтва. Нядаўна атрымалі ад Урада прапанову прыняць удзел у стварэнні сеткавых аб'яднанняў па настаўніцтве для пашырэння эканамічных магчымасцяў жанчын. Думаю, абмяркуем гэтае пытанне на пасяджэнні прэзідыума і, вядома, будзем развіваць гэтую работу. У кожнай жанчыны павінны быць магчымасці для рэалізацыі сваіх здольнасцяў, дасягнення пастаўленых мэт, і калі мы можам тут садзейнічаць — мы павінны гэта рабіць.*

**Раман Матульскі, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:**



*— Наш унёсак у Год навукі — гэта якраз праекты, прысвечаныя 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Галоўны праект — узнаўленне факсімільнай спадчыны Францыска Скарыны, над якім мы працавалі пяць гадоў. Мы ганарымся, што выданне стала брэндам нашай краіны. Паводле выказванняў замежных калег — кнігавыдаўцоў, бібліятэкараў, навукоўцаў, — праекта такога*

*кшталту яшчэ не было. Не адна-дзве кнігі выпушчаныя, як звычайна аднаўляюць першадрукі, а поўны збор выданняў Скарыны — дваццаць тамоў і том навуковых каментароў. Даследаванні, праведзеныя ў працэсе падрыхтоўкі, зрабіліся асновай практычна ўсіх другіх выданняў, прысвечаных Скарыну і юбілею беларускай кнігі. Мы падарылі камплекты спадчыны першадрукара ўсім вышэйшым навучальным установам краіны, буйнейшым бібліятэкам свету. Дабіліся, каб кожны жыхар Беларусі мог прыйсці ў сваю публічную абласную ці раённую бібліятэку і пагартаць выданні Скарыны. Перад намі стаяла і задача папулярызаваць нашу гісторыю, багатую духоўную спадчыну ў свеце. Даказаць, што з гэтай спадчынай Беларусь — роўная сярод роўных.*

**Павел Маісееў, загадчык аддзела арганізацыі супрацьракавай барацьбы РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава:**



*— Такі напрамак медыцыны, як анкалогія, абавязвае па-асабліваму мець зносіны з пацыентамі — гэта краевугольны камень іх выздараўлення і нашай паспяховай работы. Мы выбудоўваем адносіны не толькі з хворым, але і са сваякамі, блізкімі, таму што, калі сям'я сутыкаецца з анкалагічным дыягназам, гэта мяняе погляды на жыццё, уносіць пэўную паніку. І ўрач павінен не проста назначыць правільнае лячэнне, але і дэталёва растлумачыць усё пацыенту, падтрымаць яго. Гэта настолькі ж важна, як і наяўнасць перадавой апаратуры, сучасных лекаў, якія ў нас ёсць сёння. Да таго ж чалавек можа яшчэ і маральны зарад атрымаць, маючы зносіны з духоўнай асобай, — на тэрыторыі цэнтра ёсць невялікая царква. Самая высокая ацэнка для нашага калектыву — гэта водгукі пацыентаў аб тым, што ў цэнтры яны адчуваюць сябе як дома.*

*Важным этапам нашай дзейнасці стала стварэнне "Дапаможніка па анкалогіі" — гэта калектыўная работа вядучых спецыялістаў, больш як 70 чалавек. Ён уключае не толькі медыцынскія моманты — як пацыента абследаваць, якое лячэнне назначаць, але і цэлы раздзел, дзе расказваецца пра этыку, мараль, пра тое, як правільна доктару наладжваць кантакт з хворым, з яго асяроддзем.*

**Муфтый Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі Абу-Бекір Шабановіч:**



*— Гэтая прэмія — вялікі стымул, арыенцір, як мы павінны будаваць работу, каб адрадзіць менавіта духоўную, нацыянальную культуру, якія прыўносяць гармонію ў жыццё грамадства і ўмацоўваюць нашу дзяржаву. Наша аб'яднанне імкнецца развіваць цікавасць да гісторыі і культуры нацыі дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы. Яшчэ ў 1997 годзе на высокім узроўні правялі мерапрыемствы, прысвечаныя 600-годдзю пасялення татараў на тэрыторыі Беларусі, летась — даволі маштабна адзначылі 620-годдзе гэтай падзеі. Прычым лейтматывам свята быў той факт, што ўсе гэтыя гады прайшлі ў міры і згодзе, мы гаварылі пра традыцыі і культуру беларускіх татараў-мусульман. Духоўная культура адраджаецца дзякуючы маштабнай асветніцкай дзейнасці — гэта арганізацыя нядзельных школ, груп, а таксама рэканструкцыя ці будаўніцтва мячэцяў, якія некалі існавалі ў Беларусі. Сёння ўжо працуюць 12, і яны служаць цэнтрамі мусульманскай культуры ў сваіх рэгіёнах. Вяхой шматгадовай работы стала адкрыццё Мінскай саборнай мячэці — мы яе аднавілі ў памяць аб тых, хто некалі яе ўзводзіў, тых, хто напаўняў яе жыццём. Мы шмат працуем і за мяжой, выступаючы прадстаўнікамі народнай, духоўнай дыпламатыі.*

**Настаяцель храма прападобнай Еўфрасінні Полацкай у гарадскім пасёлку Івянец протаіерэй Віктар Перагудаў:**



*— Тое, што так высока была прызнана наша работа, — сведчанне, што грамадства разумее, наколькі сёння важнае пытанне сацыяльнага служэння царквы. Яно накіравана на дапамогу людзям, якія знаходзяцца ў цяжкім становішчы, дзеткам, якія маюць фізічныя і псіхалагічныя асаблівасці. Мы займаемся духоўнай апекай, каб гэтыя дзеці атрымалі свой першы духоўны досвед, знайшлі свой шлях да Бога, атрымалі веды і навыкі ў першай, нават самай простай малітве. Мы маем Дом міласэрнасці, куды мы збіраем і дзетак з дзіцячага дома-інтэрната, і з сем'яў, і там у цёплых сямейных абставінах займаемся малітвай, наведваем царкву. Да нас прыязджаюць мастакі з Беларускага саюза мастакоў, іншыя валанцёры, якія знаёмяцца з дзецьмі, дапамагаюць ім, праводзяць час разам, напрыклад, гуляючы па лесе. Дзеткі праходзяць і працатэрапію, робяць тое, што ім пад сілу: дапамагаюць сушыць сена, паліваць агарод. У нас нават ёсць шатландскі поні, на якім можна пакатацца. Усё гэта дапамагае ў сацыялізацыі, вучыць любові да жывёл і прыроды. Прыемна, што геаграфія нашых валанцёраў пашыраецца і ўсё больш людзей далучаецца да гэтай добрай справы. Вядома, гэта, як і прызнанне грамадства, натхняе нас на яшчэ больш плённую працу на карысць нашым дзецям.*

**Кацярына Дулава, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі:**



*— Наша акадэмія шмат гадоў вядзе актыўную творчую дзейнасць, і яна, на мой погляд, з'яўляецца важным складнікам у адукацыйным працэсе творчай асобы. Удзел у маштабным музычным шоу "Талент краіны", якое мы рабілі сумесна з тэлеканалам АНТ, а таксама праектах "Дакрананне" і "Пасхальны фестываль" у аднолькавай ступені важныя і для нашых студэнтаў, і для ўсіх тых, каму яны адрасаваны. Кожны з гэтых праектаў звернуты да высокага тону душы чалавека і адыгрывае значную ролю ў выхаванні яго як асобы. Спецпрэмія Прэзідэнта ёсць сведчанне таго, што наша дзейнасць патрэбная, важная, запатрабаваная і ўспрымаецца грамадствам як адзін з найважнейшых складнікаў духоўнага жыцця краіны.*

Дзяніс **Аляксандраў**